Л.І. Казлоўская,
дацэнт Беларускага універсітэта культуры

# НЕКАТОРЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА АРГАНІЗАЦЫІ ПРАКТЫКІ СТУДЭНТАЎ КАФЕДРЫ ПЕДАГОГІКІ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

На кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці распрацавана пэўная навуковая сістэма праходжання практыкі студэнтамі спецыялізацыі. Можна вылучыць тры этапы ў рэалізацыі прапанаванай сістэмы.

На першым этапе студэнты знаёмяцца з дзейнасцю пазашкольных культурных устаноў па правядзенні вольнага часу, цэнтраў сацыяльна-педагагічнай рэабілітацыі, дзіцячых аздараўляльных цэнтраў і інш. Пры гэтым практыканты з'яўляюцца гледачамі, а не ўдзельнікамі і арганізатарамі розных формаў культурна-адпачынкавай дзейнасці. Метадычны аналіз культурна-адпачынкавых праграм студэнтаў заключаецца ў:

— вызначэнні мэты, педагагічных задач з улікам спецыфікі аўдыторыі;

— суаднесенасці зместу праграмы пастаўленым выхаваўчым задачам;

— разнастайнасці выкарыстаных метадаў і сродкаў выхаваўчага ўздзеяння;

— лагічнай узаемасувязі структурных кампанентаў праграмы;

— методыцы вядзення праграмы;

— прыёмах актывізацыі аўдыторыі;

— уменні афармлення аўдыторыі.

Усё гэта садзейнічае фарміраванню прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных для рэалізацыі культурна-адпачынкавых тэхналогій і вызначэння іх выхаваўчай выніковасці.

На дадзеным этапе студэнты таксама вывучаюць вопыт асноўных накірункаў выхаваўчай работы з дзецьмі, молад-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзю, сем'ямі, пенсіянерамі ў кожным канкрэтным соцыуме. Завяршаецца практыка справаздачай аб выкананні заданняў практыкі і абаронай перад камісіяй.

На другім этапе праходжання практыкі студэнты спецыялізацыі прымаюць удзел у арганізацыі і правядзенні культурна-адпачынкавых праграм, дзіцячых свят, канцэртаў, фестываляў, дзіцячых аб'яднанняў і інш.

Яны з'яўляюцца вядучымі гульняў, конкурсных праграм, пішуць сцэнарыі, выконваюць разнастайныя творчыя і арганізацыйныя задачы, знаёмяцца з індывідуальнай, групавой, масавай работай у соцыуме, прымаюць удзел у планаванні сацыякультурнай дзейнасці. Студэнты засвойваюць методыку падрыхтоўкі і правядзення культурных праграм па правядзенні вольнага часу, якая ўключае сістэму ведаў аб фарміраванні змястоўнасці яе, характары і спецыфіцы эмацыянальнага ўздзеяння.

Гэта дазваляе студэнтам пашырыць прафесійны кругагляд, у іх фарміруюцца такія якасці, як адказнасць, што дазваляе хутчэй сцвердзіцца ў прафесійных адносінах. У іх з'яўляецца магчымасць суаднесці папярэднія ўяўленні аб будучай прафесіі з патрабаваннямі самога жыцця. Акрамя таго, на другім этапе праходжання практыкі ў студэнтаў фарміруюцца:

— адаптацыйныя навыкі (здольнасць хутка ўвайсці ў калектыў, устанаўліваць кантакты з людзьмі);

— творчыя навыкі (здольнасць да прадметнай дзейнасці, якая вызначаецца навізной, арыгінальнасцю, развіццём фантазіі і ўяўлення);

— навыкі суразмоўніцтва (стыль узаемаадносін, манера, тон, паважлівыя адносіны да субяседніка, уменне слухаць, педагагічны такт).

Апрача таго, у такім рэальным вытворчым працэсе педагог вызначае ўзровень творчых і арганізацыйных здольнасцей студэнта.

На трэцім этапе ў заданнях практыкі прадугледжваюцца самастойная падрыхтоўка і правядзенне студэнтамі куль-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

турна-адпачынкавых праграм. Варта адзначыць, што часцей за ўсё гэта аўтарскія сацыяльна-культурныя праекты, якія ўключаюць у сябе ўсе раздзелы змястоўнай і пастаноўчай дзейнасці ад задумы да яе рэалізацыі, гэта значыць, мэты, задачы, характарыстыку аўдыторыі, для якой распрацаваны праект, арыгінальныя формы вырашэння тэматычнай задумы.

У сацыяльна-культурным праекце, як правіла, студэнты выкарыстоўваюць разнастайны змест і формы культурна-адпачынкавай дзейнасці, такія, як вечары адпачынку, маладзёжныя дыскатэкі, сустрэчы з цікавымі людзьмі, ток-шоу, вечарніцы, музыкальныя і тэатральныя салоны і інш.

Акрамя таго, у сацыяльна-культурным праекце прадугледжана збліжэнне культурна-адпачынкавай дзейнасці з разнастайнымі псіхатэрапеўтычнымі тэхналогіямі: гульнятэрапіяй, музыкатэрапіяй, цацкатэрапіяй, тэатратэрапіяй, метадам псіхадрамы, што дазваляе студэнтам уплываць на паводзіны асобы ў сацыяльным асяроддзі, зніжаць праблемы канфліктных сітуацый, рэгуляваць зносіны, нармалізаваць сістэму міжасобасных зносін.

Прыкладам могуць быць такія сацыяльна-культурныя праекты, як "Пададзім адзін аднаму руку", "Надзея", "Вясёлка", распрацаваныя для людзей з праблемамі зроку, а таксама вучняў 159-й сярэдняй школы г.Мінска.

Апрача таго, студэнты ў праекце прадугледжваюць яго фінансава-эканамічную частку з указаннем кошту ўсіх відаў творчай працы, кансультацый, рэквізіту і інш. Як правіла, сацыяльна-культурны праект з'яўляецца часткай дыпломнай працы студэнта, які апрабаваны ва ўмовах канкрэтнага соцыуму.

Пасля здачы аўтарскай культурна-адпачынкавай праграмы ў прысутнасці педагогаў кіраўнікі ад базы практыкі, студэнты праводзяць круглы стол, у час якога падрабязна аналізуюцца і ацэньваюцца ўсе этапы работы студэнта. Завяршаецца практыка пісьмовай справаздачай з абавязко-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вым дадаткам (сцэнарыі, запрашальныя білеты, рэклама, водгукі гледачоў і г.д.).

На наш погляд, такая структура арганізацыі і правядзення практыкі з'яўляецца найбольш аптымальнай і дае магчымасць студэнтам рэалізаваць свае прафесійныя веды, уменні і навыкі, атрыманыя ў працэсе навучання ў Беларускім універсітэце культуры.

**М.А.Каралькоў,**
прафесар Беларускага універсітэта культуры

## СПЕЦЫФІКА ПРАКТЫКІ НА ФАКУЛЬТЭЦЕ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ

Падрыхтоўка ў вышэйшых навучальных установах высокакваліфікаваных спецыялістаў шырокага профілю, якія спалучаюць фундаментальныя веды з практычнымі ўменнямі і навыкамі і могуць хутка адаптавацца на месцы працы пасля заканчэння вучобы, самастойна папаўняць свае веды, развіваць уменні ў канкрэтнай вобласці, — актуальная праблема сённяшняга часу. Паспяховае яе рашэнне шмат у чым залежыць ад арганізацыі вучэбнага працэсу, ад таго, наколькі формы і метады навучання задавальняюць патрабаванням мэтавай падрыхтоўкі студэнтаў да вытворчай дзейнасці, і ў немалай ступені ад таго, як арганізавана вытворчая і педагагічная практыка студэнтаў.

Адукацыя студэнтаў на факультэце мастацкай творчасці Беларускага універсітэта культуры мае сваю спецыфіку. Спецыфіка менавіта ў тым, што студэнты факультэта атрымліваюць не адну, а, як правіла, дзве і больш кваліфікацый.

Па-першае, наш выпускнік набывае кваліфікацыю кіраўніка мастацкага калектыву, і ў гэтым сэнсе ён павінен мець глыбокія веды па спецыяльных дысцыплінах, а па-другое, пасля заканчэння універсітэта ён атрымлівае кваліфікацыю выкладчыка спецыяльных дысцыплін.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ